В завоеванных районах Византии и Египта арабы переняли новую форму книги — кодекс. Каллиграфия и оформление книги достигли особенно высокого уровня развития в эпоху Аббасидского халифата, чему, несомненно, способствовал расцвет научной и художественной литературы.

Наиболее ранним и широко распространенным уже в VII—VIII вв. был так называемый куфический шрифт, выделявшийся прямолинейностью и подчеркнутой угловатостью начертания. Но для скорописи он не годился и в дальнейшем стал использоваться только в декоративных целях. С IX—X вв. выработался упрощенный, округлый курсивный шрифт.

В арабских странах развивалось и искусство книжного орнамента и миниатюры. Однако оно сдерживалось тем, что ислам, во избежание идолопоклонства, запрещал изображение человеческих фигур и даже животных. Поэтому в оформлении богослужебной литературы применялись только растительный и геометрический орнаменты, зачастую очень высокого художественного достоинства.

Высшим достижением арабской книжной миниатюры стала многотомная "Книга песен", иллюстрированная мастером аль-Бадри для мусульманского султана Бадр ад-Дина Лулу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Прэдзеіна А.В.,**
*аспірантка кафедры*
*бібліяграфіі і дакументазнаўства*

## КЛАСІФІКАЦЫЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ПАТРЭБНАСЦЕЙ РЭГІЯНАЛЬНАГА ХАРАКТАРУ

Як вядома, інфармацыйныя патрэбнасці рэгіёна дзеляцца на агульныя і спецыфічныя (рэгіянальныя). Мы ў сваім артыкуле спынімся толькі на рэгіянальных

інфармацыйных патрэбнасцях (РІП). Пасля аналізу нешматлікіх публікацый па пытаннях азначэння сутнасці, узроўняў і структуры РІП, а таксама фактараў, якімі яны дэтэрмінуюцца, мы прыйшлі да выніку, што па гэтых праблемах у навуцы існуюць часам вельмі супярэчлівыя меркаванні. У перыяд 70—80-х гадоў гэту праблему ў сваіх працах разглядалі Р.Б.Ажэева, Т.А.Вараб'ёва, А.А.Ціхагласава, М.С.Карташоў, М.І.Кірсанава, Т.А.Каралёва, А.Н.Лебедзева, Д.С.Лейві, Г.М.Вольберг, М.М.Шчэрба. Але яна разглядалася адначасова з іншымі праблемамі. Толькі артыкул А.М.Маславай цалкам прысвечаны гэтай тэме. У бібліяграфазнаўстве Беларусі рэгіянальныя ІП знайшлі таксама адлюстраванне ў працах В.Е.Лявончыкава, У.М.Герасімава.

Вызначым сутнасць паняцця "рэгіянальныя патрэбнасці". Як вядома, родавым паняццем да рэгіянальных інфармацыйных патрэбнасцей, якія нас цікавяць, з'яўляецца фундаментальная катэгорыя "інфармацыйныя патрэбнасці". Гэтае паняцце з'яўляецца міжнавуковым, таму што яно выкарыстоўваецца і распрацоўваецца ў тэорыі інфармацыі, бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і іншых навук. Аднак адны аўтары трактуюць яго як паняцце "патрэбнасць" (неабходнасць), "дэфіцыт у інфармацыі", іншыя вызначаюць з дапамогай катэгорыі "веды". Трэція (дактары педагагічных навук, прафесары А.У.Сакалоў, В.Е.Лявончыкаў) сцвярджаюць, што паняцце "інфармацыйныя патрэбнасці" адносіцца да абстрактнага, збіральнага, якое выкарыстоўваецца пры інфармацыйным падыходзе да вывучэння патрэбнасцей асобы і грамадства.

Метадалагічнай асновай для вывучэння рэгіянальных інфармацыйных патрэбнасцей з'яўляецца, на наш погляд, падыход з улікам ведаў, гэта значыць патрэбнасці ў ведах, якія дэтэрмінаваны ўсімі відамі дзейнасці асобы (прадметна-практычнай, пазнавальнай, камунікатыўнай, каштоўнасна арыентацыйнай). Калі зыходзіць з такога разумення родавага паняцця, мы можам яго экстрапаліраваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

на катэгорыю, якая нас цікавіць. Рэгіянальныя інфармацыйныя патрэбнасці — гэта патрэбнасці ў ведах аб рэгіёне ці, па-іншаму, патрэбнасці ў ведах аб развіцці яго эканомікі, культуры, навукі і інш. Рэгіянальнае веданне можа быць навуковым, жыццёвым, эстэтычным (ці мастацкім) і інш.

Наяўнасць у чалавека патрэбнасці ў ведах аб праблемах "малой радзімы", дзе ён нарадзіўся, вырас, жыве і працуе, пацвярджаюць вынікі, атрыманыя ў ходзе даследаванняў, праведзеных вучонымі. Так, аналіз матэрыялаў сацыялагічнага даследавання "Савецкі чытач" (60-я гады) выявіў, што самы вялікі працэнт газет, якія выпісвала сельскае насельніцтва (ад 24 да 90), прыйшоўся на мясцовыя газеты (абласныя і раённыя), шырокі водгук знайшлі ў насельніцтва агляды літаратуры па мясцовым радыё. Вынікі аналізу запытаў чытачоў, праведзенага былой Дзяржаўнай бібліятэкай імя У.І.Леніна, паказалі, што попыт на кнігі мясцовых выданняў склаў 47%. У пачатку 70-х пры вывучэнні інфармацыйных патрэбнасцей спецыялістаў аказалася, што працэнт неабходнай літаратуры па профілі народнай гаспадаркі канкрэтнага рэгіёна быў высокі. Таму даследчыкі праблемы інфармацыйных патрэбнасцей правамерна зрабілі вывад аб неабходнасці мець у абласных бібліятэках поўныя зборы краязнаўчай літаратуры (на гэта ж указалі і апытаныя імі рэспандэнты).

Узроўні рэгіянальных інфармацыйных патрэбнасцей у працы А.М.Маславай раздзелены на калектыўны, індывідуальны, у працах М.М.Шчэрбы — на прафесійны і непрафесійны (або агульнаадукацыйны).

Разглядаючы фактары, якія ўплываюць на характар РІП, А.М.Маслава вылучае аб'ектыўныя ўмовы (прыродныя, сацыяльна-эканамічныя, гістарычныя асаблівасці рэгіёна, агульныя тэндэнцыі яго развіцця, тыя актуальныя навуковыя і практычныя задачы, якія ставяцца ў рэгіёне на першы план у вызначаны перыяд) і суб'ек-

тыўныя фактары (асаблівасці структуры і ступень падрыхтаванасці кадраў, якія займаюцца рэгіянальнымі праблемамі). Е.Б.Койдан пры вывучэнні інфармацыйна-бібліяграфічнага абслугоўвання спецыялістаў культуры і мастацтва (на прыкладзе Магаданскай вобласці) прапанавала ўлічваць два асноўных фактары, якія ўплываюць на спецыфіку інфармацыйных патрэбнасцей:

1) адміністрацыйна-службовая прымета (на яе аснове вылучаюць тыпы спецыялістаў);

2) характар працы спецыялістаў. Грунтуючыся на новым вучэнні аб інфармацыйных патрэбнасцях, якое існуе ў навуцы, паспрабуем вызначыць свой пункт гледжання па гэтым пытанні.

Зыходзячы з факта, што чалавек уяўляе адзінства біялагічнага і сацыяльнага, патрэбнасць у інфармацыі таксама выяўляе сябе як на ўзроўні біялагічным, так і на ўзроўні сацыяльным, набываючы на кожным з іх свае спецыфіку і структуру. Яшчэ на першай ступені свайго развіцця людзям, калі яны жылі невялікімі групамі, даводзілася вырашаць праблемы, якія былі звязаны з патрэбнасцю выжыць. Гэта выклікала “патрэбнасць у кантакце”. Можна дапусціць, што першапачаткова пры пошуку кантактаў, у працэсе іх ажыццяўлення абмяркоўваліся надзённыя тэмы, якія былі звязаны з асаблівасцю дадзенай мясцовасці, для арганізацыі палявання, гаспадаркі і г.д. Патрэбы ў арыентацыі, пераймацні таксама фарміруюцца з таго мікраасяроддзя, у якім чалавек нарадзіўся, вырас. Так, мы лічым правамерным вылучэнне біялагічных рэгіянальных інфармацыйных патрэбнасцей, унутраную структуру якіх складаюць патрэбы ў кантакце, арыентацыі і пераймацні. І гэта, на наш погляд, з’яўляецца тлумачэннем назірання М.М.Шчэрбы таго, што ўсе наведвальнікі бібліятэк могуць быць патэнцыяльнымі чытачамі літаратуры аб родным краі, абанентамі краязнаўчага бібліяграфічнага абслугоўвання. Кожны чалавек усвядомлена ці не з’яўляецца патрыётам свайго



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сяла, раёна, вобласці. Краязнаўчай літаратурай, краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыяй можа зацікавіцца кожны жыхар, патэнцыяльныя перадумовы закладзены ў кожным з нас. “Няма такога чалавека,— пісаў М.М.Шчэрба,— які пры сустрэчы з краязнаўчым матэрыялам (кнігай, артыкулам, аўдыёвізуальнымі дакументамі, бібліяграфічным паведамленнем і г.д.) застаўся б абыякавым”.

Чалавек жыве ў грамадстве, таму і спосаб задавальнення яго патрэб абумоўлены ім. Значыць, яго біялагічныя патрэбы сацыялізаваны. Грамадства, а ў нашым выпадку гэта перш за ўсё мікраасяроддзе, якое вызначаецца месцам жыхарства, уплывае ў пэўны гістарычны адрэзак часу на прымальныя формы патрэбнасцей.

Узровень інфармацыйных патрэбнасцей, якія фарміруюцца ў працэсе сацыялізацыі асобы, навукоўцы адносяць да сацыяльных. На ўзроўні сацыяльных інфармацыйных патрэбнасцей Н.Б.Зіноўева вылучае наступную іх структуру: пазнавальныя інфармацыйныя патрэбнасці, інфармацыйныя патрэбнасці ў сацыяльнай арыентацыі асобы, інфармацыйныя патрэбнасці ў сацыяльнай ідэнтыфікацыі. Па аналогіі правамерна разглядаць узровень сацыяльных рэгіянальных патрэбнасцей.

Іншы пункт гледжання на ўзроўні і структуру інфармацыйных патрэбнасцей мае прафесар А.У.Сакалоў. Ён вылучае тры ўзроўні патрэбнасцей, якія звязаны прычынна-выніковай (генеалагічнвй) залежнасцю. Першы ўзровень — абсалютныя патрэбнасці (канечнае мноства прыроджаных патрэбнасцей, уласцівае ўсім суб’ектам дадзенага класа). У сваю чаргу яны падраздзяляюцца на біягенныя (лінгвістычныя), мнемічныя, кантактныя і сацыягенныя (пазнавальныя, этычныя, эстэтычныя, рэлігійныя). Другі ўзровень — патрэбнасці ва ўмовах, сродках і метадах для выканання мэтанакіраванай дзейнасці), трэці — спантанныя (выпадковыя патрэбнасці, якія непрадказальна ўзнікаюць у працэсе індывідуальнай жыццядзейнасці суб’екта).

Абсалютныя інфармацыйныя патрэбнасці закладзены ў генетычных праграмах, напрыклад здольнасці людзей да моўнай дзейнасці. Своечасовае іх задавальненне з'яўляецца неабходнай перадумовай захавання суб'екта.

Другасныя інфармацыйныя патрэбнасці ўзнікаюць эпізадычна і знікаюць пры іх задавальненні. Колькасць гэтых патрэбнасцей вызначаецца колькасцю відаў дзейнасці, а незадаволенасць іх вядзе да кампенсавання іншымі або да змянення віду дзейнасці.

Спантанныя інфармацыйныя патрэбнасці ў адрозненне ад папярэдніх не аб'ектыўныя, а суб'ектыўныя, і ў выніку задавальнення яны ўзмацняюцца, а незадавальненне іх перажываецца хваравіта. Крыніцамі спантанных ІП з'яўляюцца інтарэсы, варожасць, цяга да чаго (каго)-небудзь, якія перарастаюць у прывычкі, слабасці, заганы. Колькасць іх бясконцая.

Па прымеце суб'екта — носьбіта патрэбнасці, зыходзячы з філасофскіх катэгорый агульнага, асобнага і адзінкавага, вылучаюцца адпаведна агульныя, прыватныя і індывідуальныя патрэбнасці. У якасці першых выступае грамадства ў цэлым, у якасці другіх — група, а ў якасці трэціх — асоба.

Аднясенне інфармацыйных патрэбнасцей да разгляду чалавечых сведчыць аб тым, што яны маюць псіхалагічны характар і ўзнікаюць у свядомасці чалавека. Разглядаючы духоўныя патрэбнасці ў залежнасці ад узростаў і грунтуючыся ў даным выпадку на вывадах сацыяльнай псіхалогіі, В.Е.Лявончыкаў вылучае наступныя ўзроўні:

1) патрэбнасці, якія адносяцца да самасцвярджэння асобы (адносіны, павага тых, хто акружае чалавека, сацыяльны статус і яго сімвалы);

2) патрэбнасці ў самаразвіцці (навуковыя, эстэтычныя, грамадска-палітычныя);

3) патрэбнасці, звязаныя з самарэалізацыяй асобы (творчая дзейнасць, барацьба за рэалізацыю ідэалаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У залежнасці ад накіраванасці асобы на той ці іншы від дзейнасці інфармацыйныя патрэбнасці раздзяляюцца на прафесійныя і непрафесійныя (агульнаадукацыйныя, агульнакультурныя, аматарскія і інш.).

Прааналізаваўшы існуючыя падыходы да вылучэння ўзроўняў і структуры інфармацыйных патрэбнасцей, мы прыйшлі да вываду, што РІП маюць перш за ўсё біялагічны і сацыяльны ўзроўні. Іх структура адпаведна складаецца з:

1) патрэбнасцей у кантакце, арыентацыі і перайманні;

2) пазнавальных рэгіянальных інфармацыйных патрэбнасцей — РІП у сацыяльнай арыентацыі асобы, рэгіянальныя інфармацыйныя патрэбнасці ў сацыяльнай ідэнтыфікацыі.

Па генеалагічнай прымеце (у адпаведнасці з вучэннем А.У.Сакалова) вылучаем: абсалютныя рэгіянальныя інфармацыйныя патрэбнасці, другасныя РІП, спантанныя РІП. У структуры абсалютных РІП вылучаюцца два ўзроўні: біягенны і сацыягенны. Унутры першага разглядаем такія патрэбнасці, як лінгвістычныя, мнемічныя і кантактныя; унутры другога — пазнавальныя, этычныя, эстэтычныя, рэлігійныя. У залежнасці ад накіраванасці асобы на той ці іншы від дзейнасці прававерна дзяліць рэгіянальныя інфармацыйныя патрэбнасці на прафесійныя і непрафесійныя. Неабходна прызнаць, што краязнаўцы дапускаюць памылку, калі разглядаюць толькі два ўзроўні: калектыўны, індывідуальны — і не вылучаюць агульны, што супярэчыць логіцы. Калі разглядаць РІП на ўзроўні асобы, індывіда, то прававерна падзяліць іх з улікам узросту людзей. Пры гэтым трэба ўлічваць групоўку духоўных патрэб, якія існуюць у сацыяльнай псіхалогіі:

1) патрэбы, якія адносяцца да самасцвярджэння асобы;

2) патрэбы ў самаразвіцці;

3) патрэбы, звязаныя з самарэалізацыяй асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод фактараў, якімі дэтэрмінаваны рэгіянальныя інфармацыйныя патрэбнасці, вылучым наступныя: аб'ектыўныя і суб'ектыўныя. Да аб'ектыўных мы адносім: геаграфічнае акружэнне, эканамічныя і сацыяльныя ўмовы, вытворчасць, навуковую спецыялізацыю, а таксама гістарычныя, культурныя, інтэлектуальныя асаблівасці, нацыянальныя, бытавыя і іншыя ўмовы канкрэтна-гістарычных супольнасцей. Да суб'ектыўных фактараў, якія адлюстроўваюць спецыфічнае ў рэгіянальных інфармацыйных патрэбнасцях, можна аднесці: асаблівасці структуры і ступень падрыхтоўкі кадраў, якія займаюцца рэгіянальнымі праблемамі; якасць і характар працы спецыялістаў. Пераважную ролю ў фарміраванні рэгіянальных інфармацыйных патрэбнасцей асобы адыгрываюць унутраныя пабуджальныя сілы: настрой, перажыванне, асаблівасці псіхічнага складу, матывы, установкі і інш., а ў іх узнікненні — культурныя традыцыі канкрэтна-гістарычных супольнасцей людзей.

**Карасцінская Н.У.,**
*аспірантка кафедры*
*бібліяграфіі і дакументазнаўства*

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПОГЛЯДЫ І.Б.СІМАНОЎСКАГА НА СТРУКТУРУ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Тэарэтычныя погляды І.Б.Сіманоўскага на беларускую бібліяграфію нельга вывучаць без разгляду яго ўяўленняў аб беларускай бібліяграфіі цалкам як грамадскай з'явы.

Прафесійная дзейнасць Сіманоўскага пачыналася ў 20-я гады нашага стагоддзя, і яго тэарэтычныя погляды складваліся менавіта пад уплывам кнігазнаўчай парадыгмы, якая існавала ў той час у бібліяграфіі. Але ў межах гэтай тэорыі склалася некалькі падыходаў да вызначэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ